Аліса Капырына

# МІСІЯ БІБЛІЯТЭКІ
## ў фарміраванні інтэлектуальнага патэнцыялу грамадства

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) з'яўляецца адным з важнейшых элементаў інфраструктуры Беларусі і выконвае функцыі рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра. Гэта гіперфункцыянальны будынак, абсталяваны па апошняму слову навукі і тэхнікі, забяспечаны ўсімі магчымымі камунікацыямі, пачынаючы з інтэрактыўнага фасада і заканчваючы тэлеліфтам для дастаўкі дакументаў.

Стаць важнейшым складальнікам інфармацыйнай індустрыі Беларусі НББ дазволіла будаўніцтва новага інтэлектуальнага будынка, які аснашчаны навейшай камп'ютэрнай тэхнікай, высокаэфектыўнымі аўтаматызаванымі тэхналогіямі. Да яго адкрыцця і ператварэння НББ у рэспубліканскі інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр, што можна з упэўненасцю назваць адлюстраваннем асаблівасцей развіцця нашага грамадства ў цэлым, яго культурнага, тэхнічнага і тэхналагічнага ўзроўняў, грамадскіх патрэбнасцей у інфармацыі, было прымеркавана правядзенне міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі *«Місія бібліятэкі ў фарміраванні інтэлектуальнага патэнцыялу грамадства»* (4–6 снежня 2006 г., Мінск, Рэспубліка Беларусь).

Мэтай канферэнцыі з'яўлялася не толькі прэзентацыя новага будынка НББ, але і абмен вопытам работы буйнейшых бібліятэк свету як інфармацыйных цэнтраў, пошук інавацыйных шляхоў развіцця бібліятэк і пашырэнне міжнароднага прафесійнага супрацоўніцтва. Арганізатарамі канферэнцыі выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Некамерцыйнае партнёрства «Бібліятэчная Асамблея Еўразіі», Беларуская бібліятэчная асацыяцыя.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел 417 дэлегатаў з 12 краін свету. Гэта прадстаўнікі бібліятэк Беларусі, краін СНД і далёкага замежжа, кнігавыдаўцы і буйнейшыя вытворцы інфармацыйнай прадукцыі, прадстаўнікі арганізацый, якія прынялі ўдзел у будаўніцтве і тэхналагічным аснашчэнні новага будынка НББ.

У праграму канферэнцыі былі ўключаны 4 секцыі, прагучала 100 дакладаў і выступленняў па актуальных аспектах развіцця бібліятэчнай справы на Беларусі, па перспектывах развіцця НББ ва ўмовах новага будынка, а таксама па такіх праблемна-тэматычных напрамках, як сусветная інфармацыйная інфраструктура і міжбібліятэчнае ўзаемадзеянне, бібліятэкі ў інфармацыйным грамадстве, роля і месца буйнейшых бібліятэк у інавацыйным развіцці краіны, нацыянальная бібліятэка і інтэлектуальныя каштоўнасці грамадства, электронная інфармацыя і праблемы аўтарскага права і інтэлектуальнай уласнасці, тэхналогія арганізацыі і асваення бібліятэчнай прасторы і іншых пытаннях.

На Пленарным пасяджэнні па асноўнай тэме канферэнцыі выступілі з дакладамі дырэктары буйнейшых бібліятэк краін СНД і Еўропы. Напрыклад, дырэктар Расійскай нацыянальнай бібліятэкі У.М. Зайцаў акцэнтаваў увагу на ролі нацыянальнай бібліятэкі ў новым інфармацыйным асяроддзі. Выконваючы традыцыйныя функцыі, нацыянальныя бібліятэкі павінны адэкватна рэагаваць на змены ў інфармацыйнай сферы і вырашаць шэраг вострых праблем, якія паставіла перад імі бурнае развіццё лічбавых і тэлекамунікацыйных тэхналогій. Дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Узбекістана А.А. Умаравым былі акрэслены перспектывы далейшага міжбібліятэчнага супрацоўніцтва, яго пашырэння ў інфармацыйным грамадстве.

У ходзе работы Пленарнага пасяджэння перад замежнымі калегамі быў асветлены вопыт работы НББ па перамяшчэнні інфармацыйных рэсурсаў у новы будынак бібліятэкі, яго асваенні, разгортванні тэхналагічных працэсаў. Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.С. Матульскі ў сваім дакладзе адзначыў, што ўвод у эксплуатацыю новага будынка дазволіў кардынальна змяніць погляд на ролю бібліятэкі ў грамадстве, пераўтварыць НББ у сучасны рэспубліканскі інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр, які адпавядае сусветным патрабаванням.

На пасяджэннях секцый была прадэманстравана работа НББ па рэалізацыі Канцэпцыі стварэння рэспубліканскага інфармацыйнага і сацыякультурнага цэнтра і выкананні даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі ва ўмовах новага будынка. Дасягненні НББ сталі даступнымі шырокай прафесійнай грамадскасці і выклікалі вялікую зацікаўленасць спецыялістаў.

Праграма канферэнцыі ўключала таксама правядзенне выставак і прэзентацый інфармацыйнай прадукцыі і паслуг арганізацый – партнёраў НББ, якія ўдзельнічаюць у аснашчэнні новага будынка НББ, аглядных і тэматычных экскурсій па новаму будынку НББ, культурныя мерапрыемствы. Больш за 10 стэндаў прадстаўлялі дасягненні вядучых кнігагандлёва-выдавецкіх прадпрыемстваў Беларусі ў развіцці выдавецкай справы. Арганізацыі – партнёры НББ па аснашчэнні новага будынка – прадстаўлялі дасягненні ў развіцці тэхналагічных комплексаў.

Паралельна з правядзеннем пасяджэнняў секцый у межах канферэнцыі 5 снежня адбылося пасяджэнне Агульнага адкрытага сходу Некамерцыйнага партнёрства «Бібліятэчная Асамблея Еўразіі». У Круглай зале для правядзення самітаў НББ за

БЕЛАРУСКАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ

сталом перагавораў прысутнічалі дырэктары нацыянальных бібліятэк краін СНД і іншыя члены Бібліятэчнай Асамблеі Еўразіі (БАЕ). Сярод пытанняў, якія абмяркоўваліся, было падвядзенне вынікаў мерапрыемстваў і праграм 2006 г. і абазначэнне прыярытэтных напрамкаў развіцця. Члены БАЕ прынялі рашэнне аб неабходнасці ўзбуйнення праграм і аб'яднання сумесных праектаў нацыянальных бібліятэк у адзіную праграму «Скарбы кніжнай культуры краін Садружнасці», што дазволіць пашырыць магчымасці бібліятэчнай супольнасці. Было прынята рашэнне заснаваць Міжнародны камітэт па падрыхтоўцы другога Еўразійскага інфармацыйнага і бібліятэчнага кангрэса, які адбудзецца ў лістападзе 2007 г. У яго склад увайшлі дырэктары ўсіх нацыянальных бібліятэк краін СНД. Таксама было прынята рашэнне аб уваходжанні ў БАЕ Нацыянальнай Парламенцкай бібліятэкі Украіны, бібліятэчныя асацыяцыі Беларусі і Украіны таксама пажадалі ўступіць у БАЕ.

Удзельнікі выказалі глыбокую ўдзячнасць арганізатарам за высокі ўзровень падрыхтоўкі і правядзення канферэнцыі, выставак і прэзентацый, якія сталі значнымі падзеямі не толькі ў грамадскім жыцці Беларусі, але і ўсёй бібліятэчнай супольнасці. З тэзісамі дакладаў з анатацыямі можна азнаёміцца на сайце НББ www.nlb.by, у бліжэйшы час матэрыялы канферэнцыі будуць выдадзены асобным электронным выданнем.

Summary

Material on the International Scientific and Practical Conference «Library Mission in Development of Society Intellectual Potential».

***5 декабря 2006 года в рамках Международной научно-практической конференции «Миссия библиотеки в формировании интеллектуального потенциала общества» прошло заседание Общего собрания Библиотечной Ассамблеи Евразии.***



В Круглом зале для проведения саммитов Национальной библиотеки Беларуси за столом переговоров присутствовали директора Национальных библиотек стран Содружества и другие члены Библиотечной Ассамблеи Евразии.

Среди обсуждаемых вопросов было подведение итогов мероприятий и программ 2006 г. и обозначение приоритетных направлений развития. Основным вопросом, тревожащим библиотечное сообщество стран Содружества, является выстраивание общей позиции по вопросам гармонизации библиотечного законодательства на постсоветском пространстве, в том числе разработка новой редакции Модельного библиотечного кодекса в 2007 г.

Члены БАЕ приняли решение о необходимости укрупнения программ и объединения совместных проектов национальных библиотек в единую программу «Сокровища книжной культуры стран Содружества», что позволит расширить возможности библиотечного сообщества.

Участники собрания подчеркнули важность проведения совместных мероприятий и участия Библиотечной Ассамблеи Евразии в работе Форума творческой и научной интеллигенции государств – участников СНГ, а также других международных мероприятий.

Учитывая позитивный опыт проведения первого Евразийского информационного и библиотечного конгресса, который состоялся в Москве в декабре 2005 г. и собрал более 500 участников из разных стран Содружества, было принято решение учредить Международный комитет по подготовке второго Евразийского информационного и библиотечного конгресса, в состав которого вошли директора всех национальных библиотек стран СНГ. Конгресс состоится в ноябре 2007 года.

Было принято решение о вступлении в БАЕ Национальной Парламентской библиотеки Украины, а также высказано желание вступить в БАЕ со стороны библиотечных ассоциаций Украины и Беларуси.

**4–6 снежня 2006 г., Мінск**
Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя

# «МІСІЯ БІБЛІЯТЭК У ФАРМІРАВАННІ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ГРАМАДСТВА»









